М. У. Гуль
Брэст, Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна

РОЛЯ ЎЛАСНАБЕЛАРУСКАЙ ЛЕКСІКІ Ў ФАРМІРАВАННІ ФІЛАСОФСКАЙ ТЭРМІНАЛОГІІ

Станаўленне беларускай нацыянальнай тэрміналогіі філасофіі прыпадае на пачатак XX ст. Выключная роля ў выпрацоўцы беларускай тэрміналогіі належыць газеце *Наша Ніва*. У газеце друкаваліся мастацкія тэксты, публіцыстычныя артыкулы, навукова-папулярныя публікацыі на розныя тэмы. У гэты час пачалі стыхійна складвацца шматлікія тэрміналогіі пры арыетацыі пераважна на выкарыстанне лексічных адзінак народных гаворак. Калі перад аўтарам стаяў выбар – сваямоўнае слова ці запазычанае, – то перавага аддавалася першаму. Вялікая патрэба ў намінацыях для з'яў грамадска-палітычнага жыцця, для спецыяльных і навуковых паняццяў прыводзіла да таго, што якасці тэрмінаў выкарыстоўваліся прастамоўныя і дыялектныя словы.

Са стварэннем Навукова-тэрміналагічнай камісіі (1921) пачынаецца мэтанакіраваная праца па фарміраванні і ўдасканаленні беларускай навуковай тэрміналогіі. У 1922–1930 гг. былі выдадзены 23 тэрміналагічныя зборнікі ў форме руска-беларускіх слоўнікаў пад агульнай назвай *Беларуская навуковая тэрмінолёгія (БНТ)*, якія былі задуманы як праекты і мелі дыскусійны характар. Выпускі БНТ утрымліваюць каля 40000 тэрмінаў розных галін навукі. Аўтары зборнікаў у асноўным кіраваліся пурыстычнымі ўстаноўкамі і імкнуліся да замены чужамоўных тэрмінаў беларускімі.

У 1927 г. надрукаваны Выпуск 11 "Грамадазнаўства" (Мінск; укладальнік праекта Уладзіслаў Чаржынскі), які уключае і некаторыя філасофскія найменні. Уласнабеларускія тэрміны ў асноўным абазначаюць назвы рэлігійных ўяўленняў (*аднабожжа*, *аднавер'е*, *бязбожжа*, *многабожжа*) і назвы абстрактных паняццяў (*вольнасьць*, *воля*, *сьветагляд*). Варта адзначыць такую тэндэнцыю Выпуску 11 (яна характэрна і для іншых выпускаў), як полінайменнасць, калі для назвы аднаго і таго ж паняцця падаюцца запазычаны тэрмін і яго сваямоўны дублет: *атэісты – бязбожнік*, *атэізм – бязбожжа*; *пацыфізм – мірлівасьць, пацыфіскі – мірлівы*, *пацыфіст – мірлівец*.

У наступнае дзесяцігоддзе быў узяты курс на збліжэнне беларускай мовы з рускай: перавага аддавалася тым адзінкам, якія мелі адпаведнікі ў рускай мове; узрасла колькасць запазычанняў-русізмаў. АН БССР пачала падрыхтоўку *Беларускай савецкай энцыклапедыі*, у 1935 г. былі выдадзены праекты слоўнікаў, сярод якіх – Выпуск 1. *Філасофія, псіхалогія,*

антырэлігійны аддзел (Мінск). Раздзел *Філасофія* гэтага выпуску складаецца з больш, чым пяцісот рэестравых слоў. Уласнаберускія адзінкі называюць асноўныя філасофскія паняцці і катэгорыі: *вечнасць, выпадковасць, грамадства, доказ, дух, змест, з'ява, магчымасць, мера, народ, неабходнасць, развіццё, роўнасць, уласцівасць, час, якасць*. У пазнейшых лексікаграфічных крыніцах многія русізмы, зафіксаваныя ў раздзеле *Філасофія*, былі заменены на беларускія адпаведнікі: *відзімасць – бачнасць, даставернасць – верагоднасць, двойственая ісціна – дваістая ісціна, звядзенне (сведение) – звесткі, мышленне – мысленне, нраўственасць – маральнасць, прадстаўленне – уяўленне, рассудак – развага, сазнанне – свядомасць, самасазнанне – самасвядомасць, умазаключэнне – выснова, умапогляд – абстрактнае разважанне, успрыяцце – успрыманне*.

Значная колькасць філасофскіх тэрмінаў утрымліваецца ў *Русско-белорусском словаре общественно-политической терминологии* пад рэд. М. В. Бірылы і М. Р. Судніка (Мінск, 1970). Гэты слоўнік быў распрацаваны ў сектары тэрміналогіі Інстытута мовазнаўства АН БССР. Сярод філасофскіх тэрмінаў данай крыніцы выяўлены наступныя лексіка-семантычныя групы ўласнабеларускіх тэрмінаў: **назвы асноўных філасофскіх катэгорый**: *быццё, час, прастора, рух, колькасць, магчымасць*; *адзінкавае, бесканечнае, наяўна-існае, непазнанае, непасрэднае*; **назвы эстэтычных катэгорый**: *брыдкае, прыгожае*; **назвы працэсаў**: *апасродкаванне, пазнанне*; **назвы ўласцівасцей**: *акрэсленасць, мнагастайнасць, непазнавальнасць, неперапыннасць, пазнавальнасць*; **назвы стану**: *веданне*. Уласнабеларускія тэрміны прадстаўлены рознымі групамі (назоўнікі, прыметнікі, дзеясловы), але асноўнае месца ў тэрміналагічнай намінацыі належыць назоўніку.

Для ўтварэння ўласнабеларускіх тэрмінаў характэрныя сінтаксічны, марфалагічны, лексіка-семантычны, марфолага-сінтаксічны спосабы. Сінтаксічны спосаб выяўляе высокую прадуктыўнасць у філасофскім тэрмінаўтварэнні: *адзінства процілегласцей, вечнасць руху, вольнасць асобы, вышэйшая форма руху матэрыі, закон адмаўлення адмаўлення*.

Дастаткова высокую прадуктыўнасць мае і марфалагічны спосаб. Беларускія філасофскія тэрміны ўтвараюцца пры дапамозе фармантаў ***-асць*** (*верагоднасць, выпадковасць, тоеснасць, цэласнасць*); ***-нн(е)*** (*апасродкаванне, апрадмечванне, сузіранне*); ***-енн(е)/-энн(е)*** (*адмаўленне, суджэнне, арэчаўленне*); ***-цц(ё)*** (*адкрыццё, быццё*). Нульсуфіксальныя тэрміны матывуюцца дзеясловамі: *развага ← разважыць*. Прэфіксальныя тэрміны ў філасофскай тэрмінасістэме ў асноўным утвараюцца пры дапамозе прыстаўкі ***не-/ня-***: *неспакой ← спакой, няволя ← воля, небыццё ← быццё, неістотнае ← істотнае*. Асноваскладанне з'яўляецца адным з

прадуктыўных спосабаў тэрмінаўтварэння. У якасці першай асновы выступаюць словы розных часцін мовы: назоўнікі (*светаадчуванне*, *светасузіранне*, *розумазаключэнне*); прыметнікі (*узаемаадносіны*, *узаемасувязь*); займеннікі (*іншабыццё*); лічэбнікі (*першапрычына*). У тэрміналогіі філасофіі дастаткова пашыраны назоўнікі-кампазіты з першым кампанентам ***сама-***: *самаадмаўленне*, *самапазнанне*, *самарух*, *самасвядомасць*, *самасупярэчнасць*.

Неабходна адзначыць той факт, што шырокі пласт лексікі, тэматычна звязанай з грамадствам, чалавекам, адносіцца да ліку агульнаўжывальных слоў, якія разам з тым з'яўляюцца тэрмінамі ў пэўных тэрміналагічных сістэмах (напрыклад, *жыццё*, *каштоўнасць*, *супольнасць* і інш.) [1, с. 51]. У розных сферах яны адрозніваюцца аб'ёмам семантыкі, аб'ёмам інфармацыі, тыпам значэння [2, с. 23]. Некаторыя агульнаўжывальныя словы набываюць спецыяльнае тэрміналагічнае значэнне і суадносяцца са спецыяльным паняццем. Гэтыя адзінкі трапляюць у навуковую сферу шляхам спецыялізацыі значэння (лексіка-семантычны спосаб) і тэрміналагізуюцца: *абавязак*, *барацьба*, *бачнасць*, *вайна*, *велічыня*, *вечнасць*, *дзейнасць*, *доказ*, *заказ*, *закон*, *зло*, *магчымасць*, *улада* і г.д.

Пэўная колькасць філасофскіх тэрмінаў з'явілася ў выніку субстантывацыі (марфолага-сінтаксічны спосаб): *адзінкавае*, *адмоўнае*, *асаблівае*, *бесканечнае*, *бессвядомае*, *выпадковае*, *знешняе*, *існае*, *існуючае*, *істотнае*, *канечнае*, *канкрэтна-непасрэднае*, *неакрэсленае*, *непазнанае*, *непасрэднае*, *складанае*, *станоўчае*, *узвышанае*, *усеагульнае*.

Кароткі тлумачальны слоўнік філософскіх, сацыяльных і культуралагічных тэрмінаў пад рэд. М.Н. Бяспамятных (Гродна, 1992) і *Тэрміналагічна-тлумачальны слоўнік па філасофіі* А.А. Скікевіча, У.С. Шчура (Мінск, 1996) сталі першымі менавіта тэрмінаграфічнымі выданнямі, якія зафіксавалі значэнне сваямоўных філасофскіх тэрмінаў. Так, згодна з *Тэрміналагічна-тлумачальным слоўнікам па філасофіі* тэрмін *адкрыццё* разумецца як 'адно з асноўных паняццяў тэалогіі і рэлігійна-ідэалістычнай філасофіі, якое выяўляе звышпачуццёвае пазнанне звышнатуральнай рэчаіснасці ў акце містычнага асвятлення' (с. 8); тэрмін *быццё* мае значэнне 'філасофская катэгорыя, якая служыць для азначэння ўсяго існуючага: матэрыяльных з'яў і сацыяльных працэсаў, што ўзнікаюць у свядомасцт чалавека, а таксама творчых актаў' (с. 15); тэрмін *жыццё* – 'форма існавання матэрыі, заканамерна ўзнікаючая пры пэўных умовах у працэсе яе развіцця; па азначэнню Энгельса, жыццё – гэта спосаб існавання бялковых целаў і г.д.' (с. 26).

Такім чынам, уласнабеларуская лексіка адыгрывала важную ролю ў станаўленні філасофскай тэрміналогіі. Ад пачатку XX ст. лексічныя багацці беларускай мовы былі адной з асноўных крыніц фарміравання філасофскай

тэрмінасістэмы. Уласнабеларускія тэрміны размяркоўваюцца па разнастайных лексіка-семантычных групах. Назоўнікі займаюць прыярытэтнае месца ў тэрміналагічнай намінацыі. Уласнабеларускія тэрміны ўтвараюцца сінтаксічным, марфалагічным, лексіка-семантычным і марфолага-сінтаксічным спосабамі.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Антанюк, Л. А. Беларуская навуковая тэрміналогія: фарміраванне, структура, упарадкаванне, канструяванне, функцыяніраванне / Л. А. Антанюк. – Мінск : Навука і тэхніка, 1987. – 240 с.
2. Даниленко, В. П. Русская терминология. Опыт лингвистического описания / В. П. Даниленко. – М. : Наука, 1977. – 246 с.